САСВЯТАМ, ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

# Гомельскі універсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 15 (802) | Аўторак, 30 красавіка 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.




## ПА МАТЭРЫЯЛАХ ПЛЕНУМА ЦК КПБ

Камуністы матэматычнага факультэта на сваім чарговым сходзе абмеркавалі вынікі работы красавіцкага пленума ЦК КПБ. З дакладам па гэтаму пытанню выступіў член ЦК КПБ рэктар ГДУ Л. А. Шамяткоў. Ён падрабязна прааналізаваў асноўныя палажэнні даклада першага сакратара Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі А. А. Малафеева, расказаў аб найбольш цікавых выступленнях удзельнікаў пленума і ў заключэнне спыніўся на тых задачах вузаўскіх камуністаў, якія вынікаюць з рашэнняў гэтага пленума. У прыватнасці, адна з важнейшых задач — актывізацыя работы са студэнтамі. І тут Леанід Аляксандравіч не быў галаслоўным. Адразу пасля вяртання з пленума ён сам прыняў актыўны ўдзел у арганізаваным парткомам універсітэта «круглым стале» камуністаў і кіраўніцтва камсамольскай арганізацыі. У ліку адказных задач ён адзначыў таксама ўзрастаючую прафесіянальную адказнасць выкладчыка ВНУ як чалавека, перадаючага моладзі не толькі веды, але і прыносячага высокі маральны пачатак.

Усе выступіўшыя ў спрэчках камуністы — загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі акадэмік АПН СССР І. Ф. Харламаў, дацэнты У. Ф. Філіпцоў, А. Ф. Васільеў, У. А. Сізоненка, прарэктар па вучэбнай рабоце М. В. Селькін, сакратар парткома І. Ф. Эсмантовіч і аўтар гэтых радкоў — адобрылі тыя асноўныя вывады Заявы ЦК КПБ «Аб бягучым палітычным моманце», якія адносяцца да ацэнкі сітуацыі ў Беларускай ССР і ў краіне, аб падтрымцы эканамічных патрабаванняў працоўных.

У той жа час выступаўшыя са здзіўленнем адзначылі той факт, што ў Заяве няма палітычнай ацэнкі дзейнасці Бюро ЦК КПБ, іншых выбраных партыйных органаў, камуністаў, займаючых ключавыя дзяржаўныя пасады ў рэспубліцы. Менавіта ад іх дзеянняў сёння залежыць палітычны аўтарытэт і пярвічных партарганізацый. Адзначалася таксама, што нельга прызнаць пераканаўчым зроблены ў дакладзе першага сакратара ЦК КПБ аналіз палітычных патрабаванняў працоўных, якія выйшлі на вуліцу.

У адным з пунктаў прынятай на сходзе пастановы запісана: «Падтрымаць рашэнне парткома і савета сакратароў БДУ імя У. І. Леніна па пытанню аб партыйнай адказнасці другога сакратара ЦК КПБ А. С. Камая («Народная газета» № 71 ад 11.04.91 г.).

Звяртаемся да пярвічных партарганізацый факультэтаў. да ўсіх камуністаў універсітэта падтрымаць указанае рашэнне парткома і савета сакратароў БДУ імя У. І. Леніна.

Звяртаемся да ўсіх пярвічных партарганізацый Гомеля падтрымаць указанную заяву».

Л. ПАЛЯКОЎ,
нам. сакратара парткома.

## Аб перспектывах развіцця

На мінулым тыдні адбылося пашыранае пасяджэнне рэктарата з удзелам дэканаў, сакратароў партбюро, старшынь прафбюро, прадстаўнікоў парткома, прафкомаў, камітэта ЛКСМБ. Разгледжана пытанне аб выкананні асноўных мерапрыемстваў па далейшаму развіццю народнай адукацыі Гомельскай вобласці. З інфармацыяй выступіў прарэктар універсітэта па завочнаму навучанню М. М. Воінаў. Галоўную ўвагу ён звярнуў на перспектывы развіцця ГДУ як флагмана вышэйшай школы на Беларускім Палессі. Размова ішла аб неабходнасці хутчэйшага будаўніцтва вучэбна-лабараторных карпусоў факультэта фізічнай культуры і гуманітарных факультэтаў, аб тых цяжкасцях, якія ёсць у гэтай справе. Адзначана таксама, што ў стадыі вырашэння знаходзіцца пошук будынка адной са школ у цэнтры горада для адкрыцця школы-інтэрната з паглыбленым вывучэннем асобных прадметаў.

Вынікі разглядаемага пытання падвёў рэктар Л. А. Шамяткоў.

## ПАЧНЕЦЦА ПАДРЫХТОЎКА ПРАВАВЕДАЎ

З будучага навучальнага года на гістарычным факультэце нашага універсітэта адкрываецца новая спецыяльнасць — «Правазнаўства». Спецыялістаў гэтага профілю прадугледжана рыхтаваць як стацыянарна, так і па завочнай форме навучання. Як забяспечыць высокі ўзровень выкладання дысцыплін па новай спецыяльнасці—ішла размова ў рэктараце. У ёй прынялі ўдзел і кіруючыя работнікі праваахоўных органаў: начальнік упраўлення юстыцыі Я. К. Аземша, начальнік упраўлення ўнутраных спраў аблвыканкома народны дэпутат БССР М. М. Серада, пракурор Гомельскай вобласці У. П. Гаўрыльчык, намеснік старшыні абласнога суда А. К. Галкін, якія зацікаўлены ў якаснай падрыхтоўцы прававедаў. Тым больш, што попыт на іх вялікі не толькі ў нашай вобласці, але і за яе межамі.

Пры абмеркаванні важнага пытання прадугледжаны меры па стварэнню спрыяльных умоў для працы выкладчыкаў новай спецыяльнасці і паспяховай вучобы студэнтаў. Будуць адкрыты адпаведныя кафедры, на якія універсітэт запросіць вопытных вучоных-юрыстаў з Гомеля, сталіцы нашай рэспублікі — Мінска, іншых гарадоў БССР і краіны.

## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Чарговае пасяджэнне Вучонага савета універсітэта, якое адбылося 25 красавіка, пачалося з традыцыйных Скарынаўскіх чытанняў. З навуковымі дакладамі выступілі іх лаўрэаты прафесары В. А. Вахрушаў, І. В. Максімей, дацэнты Д. Р. Лін, У. М. Семянчук. Ва ўрачыстай абстаноўцы в. а. рэктара М. В. Селькін уручыў ім ганаровыя дыпломы лаўрэатаў і грашовыя прэміі.

Галоўны бухгалтар універсітэта І. А. Курава выступіла па пытанню выканання каштарысаў і іх выкарыстання.

Дэканы: фізічнага факультэта — І. В. Семчанка, геалагічнага — А. П. Пінчук, завочнага—М. Н. Мурашка выступілі са справаздачамі аб арганізацыі набору студэнтаў на новы 1991-92 навучальны год. Вырашана на інжынерныя, эканамічныя і правазнаўчую спецыяльнасці 75% студэнтаў набраць на аснове індывідуальных дагавораў.

## АБ СВЯТОЧНАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ

**Заўтра ў Гомелі адбудзецца традыцыйная дэманстрацыя працоўных горада, прысвечаная святу вясны, міру працы — 1 Мая. У ёй прымуць удзел прадстаўнікі ўсіх факультэтаў і структурных падраздзяленняў нашага універсітэта. Хто жадае прыняць удзел у дэманстрацыі, сабрацца каля галоўнага корпуса ГДУ. Пастраенне ў калону— у 8.45.**



На здымку: в. а. рэктара М. В. Селькін уручае дыплом лаўрэата Скарынаўскіх чытанняў прафесару В. А. Вахрушаву.

Фота У. Чысціка.

